Падтрымай "Вясну" на PATREON

Хроніка палітычнага пераследу 9-10 жніўня — у гадавіну паслявыбарчых пратэстаў дапоўнена

09.08.2021 **Тэгі**: затрыманні

Праваабарончы цэнтр "Вясна" збірае факты палітычнага пераследу па ўсёй краіне за 9-10 жніўня. У гадавіну паслявыбарчых пратэстаў людзей працягваюць затрымліваць, праводзіць вобшукі і ўжываць іншыя формы ціску за іх актыўную пазіцыю. Таксама на выходных перад дзявятым жніўня людзей затрымлівалі прэвентыўна і праводзілі "прафілактычныя гутаркі" аб недапушчальнасці ўдзелу ў пратэстах.

> ***Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:***
>
> - ***праз тэлеграм-бот @viasna_bot;***
> - ***на гарачую лінію ў тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna***

Дзясятае жніўня

У Мінску каля ст. метро Пушкінская адбыліся затрыманні людзей, якія прышлі ўскласці кветкі да месца гібелі Аляксандра Тарайкоўскага. Адзін з затрыманых - **Кастусь Цаўлоўскі.** Ён хацеў ускласці кветкі на мемарыял Тарайкоўскому, паклаў ружу на выхадзе з метро і пайшоў па лесвіцы уніз. Да яго падбеглі супрацоўнікі ў цывільным і затрымалі.

Дзявятае жніўня

Мінск

У Мінску ў раёне плошчы Перамогі быў затрыманы **Міхаіл Кляпец.** Пасля затрымання яго павезлі дадому на вобшук. Падрабязнасці высвятляюцца.

Праваабаронцам паведамілі, што ў Мінску на плошчы Незалежнасці прыкладна каля 16:20 двое супрацоўнікаў у цывільным затрымалі аператара і журналістку аўстрыйскага тэлебачання, якія бралі інтэрв'ю ў мінакоў. Спачатку адвялі ў шэры "Форд транзіт" за Чырвоным касцёлам, затым перавялі ў сіні аўтобус МАЗ. Далейшае месцазнаходжанне журналістаў невядомае.

Таксама вядома пра затрыманне ў Мінску **Вольгі Блешчык, Дзмітрыя Нізоўцава, Інэсы Нікулінай, Юрыя Палевікова, Мікалая Мешыча, Уладзіслава Петрашкевіча, Максіма Петрашкевіча.**

Бабруйск

А ў Бабруйску з раніцы праходзяць ператрусы ў людзей, якія праходзілі па адміністрацыйных па 23.34 (цяперашні 24.23 КаАП). Вымаюць тэхніку, шукаюць сцягі і іншую прадукцыю. Вядома як мінімум пра 10 ператрусаў. Сярод тых, да каго прыйшлі, — **Юлія Загрышава, Дзмітрый Косцін, Яўген Мамойка, Ганна Аксюціна**.

Вілейка

У Вілейцы затрыманы актывіст **Андрэй Кудзік**.



Андрэй Кудзік. Фота з Facebook

Інтэрнэт-выданне **Zerkalo.io**, якое зрабіла частка былой каманды TUT.BY, хочуць прызнаць экстрэмісцкім.

«На інтэрнэт-рэсурсе Zerkalo.io журналістамі каманды TUT.BY працягваецца інфармацыйны ціск, накіраваны на размяшчэнне інфармацыі з ухілам на дыскрэдытацыю органаў дзяржаўнай улады», — гаворыцца ў абгрунтаванні МУС, паведамляе @tutby_official.

Раніцай дзявятага жніўня на бацькоўскім лецішчы ў вёсцы Мяцявічы Салігорскага раёна быў затрыманы аматар-раварыст **Аляксандр Рыбка**, піша "Новы час". Цягам апошняга года яго некалькі разоў затрымлівалі і судзілі па "народным" артыкуле 23.34 КаАП (зараз 24.23 КаАП - удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве), пасля чаго ён адбываў арышты.

> *"Каля 7 гадзін раніцы Саша прыгатаваў сабе ежу, але не паспеў пад'есці,* — дзеліцца атрыманай інфармацыяй маці Валянціна Уладзіміраўна. — *Суседзі бачылі, што пад'ехалі два бусы з мігалкамі, выскачылі амапаўцы ў чорных масках, атачылі дом. Дзеля вобыску пачалі шукаць панятых, шмат хто з суседзяў катэгарычна адмовіўся.*
>
> *Пасля зрабілі пратрус і перавярнулі ўвесь дом. Па якім артыкуле яго затрымалі — невядома. Яшчэ будзем даведвацца. Вывелі яго з дому толькі а дзясятай — у кайданках, майцы і шортах.*

Ужо ў абед слуцкія міліцыянты пераскочылі праз плот (варотцы былі зачынены на ключ) і ўвайшлі ў дом бацькоў у Слуцку. Дома быў толькі глухі бацька, якога напалохала такая спецаперацыя. Нічога крамольнага міліцыянты ў доме не знайшлі.

Дзе ў дадзены момант занодзіцца затрыманы - высвятляецца.

Ціск і затрыманні актывістаў напярэдадні дзявятага жніўня

Магілёў

У нядзелю восьмага жніўня у Ленінскім РАУС Магілёва за адзін раз знаходзілася каля 20 чалавек. Усіх выклікалі позвамі пад рознымі добрапрыстойнымі падставамі, піша MayDay.

У асноўным, увагу надалі тым людзям, якіх прыцягвалі ў 2020-2021 годзе да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Але былі ў агульным натоўпе і іншыя — тыя, хто размяшчаў у сваіх сацсетках і мэсэнджарах рэпосты з медыя, якія ўлады Рэспублікі Беларусь прызналі экстрэмісцкімі. Міліцыянты глядзелі смартфоны магілёўцаў і абураліся, калі знаходзілі там падпіскі на "экстрэмісцкія" тэлеграм-каналы.

Берасцейшчына

Затрыманні на выходных 7-8 жніўня прайшлі ў Бярозе, Белаазёрску, Жабінцы, Пінску. Так, у Жабінцы на 72 гадзіны быў затрыманы сын забітага Генадзя Шутава **Дзмітрый Шутаў**. Прычына невядомая. Агулам у Жабінцы 7 жніўня затрымалі 15 чалавек, дваіх пазней адпусцілі.



Дзмітрый Шутаў

У Пінску 7 жніўня затрымалі сына праваабаронцы Веранікі Івановай **Кірыла Іванова**. Затрыманне праводзіў участковы Яўген Атока. Кірыла абвінавацілі ў тым, што ён нібыта пісаў пагрозы ў «экстрэмісцкіх чатах». Раней яго затрымлівалі ў жніўні 2020. Тады ён атрымаў 10 сутак арышту.

Бярозаўскія міліцыянты наведвалі кватэры тых, хто быў заўважаны на леташніх паслявыбарчых акцыях пратэсту, і праводзілі прафілактычныя гутаркі, пагражалі, а таксама бралі падпіскі пра няўдзел у акцыях супраціву рэжыму. 7 жніўня ўварваліся ў кватэры бярозаўскіх і белаазёрскіх актывістаў, затрымалі і змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання Бярозаўскага РАУС. Забралі і тых, хто не меў ніякага дачынення да акцый, піша "Радыё Рацыя".

Мінск

У Мінску на выходных 7-8 жніўня былі затрыманы **Мікіта Шэлікаў і Дзмітрый Панчанка.**

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 920 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Правазабаронная праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY